жизни в Михайловском, любил говорить пословицами и поговорками. Пушкин угощал Иону ромом и наливками и вывел его в лице Варлаама в "Борисе Годунове"»[72]. Известно, что в библиотеке поэта находились две специальные работы, посвященные этому жанру: «Полное собрание русских пословиц и поговорок» И.Богдановича и «Собрание 4291 древних российских пословиц» (М., 1770) — последнее с многочисленными пометками Пушкина на полях[73]. И.М.Снегирев, также издавший четырехтомное собрание «Русские в своих пословицах» (М., 1831–34), знакомил Пушкина со своей работой. В дневнике от 15 мая 1836 года Снегирев записал: «Утром я был у Пушкина, который обещался написать разбор моих "Пословиц"»[74].

Итак, работа Пушкина в годы Михайловской ссылки была весьма плодотворна. Весьма ценным приобретением для него как поэта и драматурга стали записи фольклора. Крестьянское слово во всех его проявлениях явилось для Пушкина источником вдохновения и получило широкое отражение в его творческом наследии.

*Наталля Наркевіч*

## ЮВЕЛІРНЫЯ ВЫРАБЫ КУЛЬТАВАГА ПРЫЗНАЧЭННЯ НА БЕЛАРУСІ Ў XII–XVI СТСТ.

Дастаткова высокі ўзровень развіцця ювелірнага рамяства ў XII–XVI стст. звязаны з накапленнем культурна-мастацкага патэнцыялу і заканамерным якасным скачком у станаўленні дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, пашырэннем асартыменту твораў і ўдасканальваннем тэхналогіі, а таксама ажыўленнем гандлёвых і культурных стасункаў.

Асобную групу ювелірных вырабаў складаюць прадметы рэлігійнага культу. Да твораў мастацкага рамяства, якія пачалі з'яўляцца з распаўсюджаннем новай веры, належаць крыжы-энкалпіёны, нацельныя крыжыкі, абразкі, абклады абразоў і кніг, царкоўнае начынне. На сённяшні дзень ёсць нямала даследаванняў, якія тычацца вывучэння розных катэгорый рэчаў хрысціянскага культу. Асноўныя падыходы да класіфікацыі такога тыпу артэфактаў прапанавалі савецкія даследчыкі. Частка вырабаў з беларускага матэрыялу апрацавана і ўведзена ў навуковы ўжытак айчыннымі археолагамі [2; 5; 9].

Бронзавыя літыя крыжы-энкалпіёны ў XII–XIII стст. займаюць важнае месца сярод помнікаў старажытнабеларускага прыкладнога мастацтва. Акрамя культавага прызначэння яны выконвалі і ролю ўпрыгажэнняў. Энкалпіёны – крыжы-складні з дзвюх частак-створак, якія насілі паўзверх адзення багатыя і вяльможныя людзі. Усе вырабы аздоблены невысокім, амаль плоскім рэльефам з выявамі святых. У цэнтральнай частцы ўсіх энкалпіёнаў – выява распятага Хрыста, а на канцах – пагрудныя выявы святых. Датуюцца падобныя вырабы XII–XIV стст. Па характары аздаблення можна меркаваць пра кіеўскае паходжанне вырабаў, менавіта яны былі асновай для наладжвання мясцовай вытворчасці. Шмат крыжоў-энкалпіёнаў вызначаецца невыразным рэльефам і недакладнымі надпісамі. Такія вырабы, хутчэй за ўсё, з'яўляюцца паўторнымі адліўкамі ў гліняных формах, адціснутых, у сваю чаргу, з гатовых энкалпіёнаў.

Цікавыя ўзоры такога кшталту пластыкі знойдзены ў Мінску, Полацку, Друцку, Магілёве, Гродне, Бярэсці, Навагрудку, Тураве, Мсціславе, Крычаве [1, с. 204–219; 5]. Сярод прывесак трапляецца шмат крыжыкаў з металу, шыферу, бурштыну, якія не заўсёды былі сімваламі хрысціянства, а выконвалі тую ж ролю, што і іншыя нагрудныя прывескі. Нацельныя літыя крыжыкі паходзяць з Полацка, Мінска, Навагрудка, Бярэсця, Турава, Пінска, Ваўкавыска і іншых гарадоў Беларусі [2, с. 396]. Яны вызначаюцца рознымі формамі і арнаментацыяй.

Каштоўнымі прадметамі рэлігійнага культу лічыліся абразкі з бронзы, медзі, свінцу, косці, каменя, шкла. Сустракаюцца шыферныя крыжыкі і абразкі ў аправе з серабра і золата. Апраўы ўпрыгожвалі сканню, гравіроўкай, чарненнем, жэмчугам, каштоўнымі камянямі. Насілі гэтыя рэчы пераважна гараджане ў складзе караляў.

Яркім прыкладам высокага ўзроўню майстэрства старажытных беларускіх рамеснікаў быў знакаміты крыж Еўфрасінні Полацкай, выкананы полацкім ювелірам Лазарам Богшам у 1161 г. Цікавасць да рэліквіі даўно выяўляюць мастацтвазнаўцы, гісторыкі, літаратары. Новыя даследаванні, архіўныя знаходкі, гіпотэзы спрыялі з'яўленню навуковых прац, прысвечаных гісторыі і мастацкім каштоўнасцям крыжа. У даследаванні яго гісторыі варта асабліва адзначыць вялікую ролю доктара гістарычных навук Л. Аляксеева. Даследчык спрыяў вяртанню крыжа ў духоўна-рэлігійнае жыццё, а ў гісторыю развіцця старажытнабеларускага мастацтва – імені таленавітага ювеліра Лазара Богшы. Не пакінулі без увагі духоўныя і мастацкія асаблівасці крыжа У. Арлоў, Т. Макарава, М. Кузьміч [7].

На характар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі XIV–XVI стст. моцна ўплываюць актыўныя гандлёвыя і культурныя сувязі Вялікага Княства Літоўскага з краінамі Заходняй Еўропы. Тэхналагічныя і мастацкія дасягненні заходнееўрапейскіх рамеснікаў творча засвойваліся і перапрацоўваліся беларускімі майстрамі, што ўзбагачала арсенал сродкаў мастацкай выразнасці, павышала творчую культуру мясцовых рамеснікаў.

---

[72] Там же. С. 281.
[73] Там же. С. 221.
[74] Там же.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прыкметны рост колькасці рамеснікаў, у тым ліку ювеліраў, выклікаў патрэбу ў спецыялізаваных прафесійных аб’яднаннях – рамесніцкіх карпарацыях XII–XIII стст., а пазней і цэхах, якія пачалі складвацца ў XV ст. Аб’яднанні майстроў па апрацоўцы каштоўных металаў утрымаліся ў Беларусі і Вільні да канца XVIII ст. [6, с. 6].

Афармленне кніг было шырока распаўсюджаным відам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва XIV–XVI стст. Асноўнымі кампанентамі афармлення старажытнай кнігі былі металічныя аздобы. Выконвалася яно з розных матэрыялаў разнастайнымі спосабамі. Часцей за ўсё майстры працавалі над аздобай пераплёту Евангелля.

Структура ўбрання кнігі фарміравалася ўжо ў раннехрысціянскі перыяд. Вокладкі выраблялі з драўляных ці металічных дошак і пакрывалі звонку цісьнёнай арнаментаванай скурай, тканінай. На візантыйскіх і старажытнарускіх помніках на вонкавым баку верхняй вокладкі Евангелля былі выявы Укрыжавання або Спаса Уседзяржыцеля ці Крыжа. Тут жа нярэдка мацаваліся драбніцы з выявамі евангелістаў альбо іх сімвалаў, херувімаў, святых. Сабраны з асобных элементаў альбо цэльнаметалічны абклад мацаваўся на верхняй вокладцы і складаўся з навугольнікаў няправільнай рамбічнай формы па краях, а для дасягнення мастацкага эфекту ў цэнтры часта рабілі сярэднік. Ніжняя вокладка мела сярэбраныя або медныя пуклі («жукі», «гузы»). Верхнюю і ніжнюю дошкі Евангелля злучалі дзве зашпількі. Драбніцы на верхняй і ніжняй дошках, на якіх былі свяшчэнныя выявы, як і пуклі і зашпількі, з’яўляліся не толькі ўпрыгажэннем: яны ахоўвалі кнігу ад механічных пашкоджанняў.

Для асабліва каштоўных пераплётаў рабілі абклад, які складаўся з суцэльных альбо фрагментарных металічных частак. Для абкладаў выкарыстоўваліся каштоўныя камяні і металы, што стала прычынай іх знішчэння падчас войнаў. Створаныя ў Вялікім Княстве Літоўскім у XIII–XIV стст. кнігі аўтэнтычных пераплётаў і абкладаў не захавалі [4, с. 236]. Па зашпільках з археалагічных раскопак можна меркаваць, што па канструкцыі і знешнім выглядзе яны знаходзіліся ў плыні ўсходнееўрапейскай традыцыі, якая бярэ пачатак у эпоху Старажытнай Русі. Кніжныя зашпількі выраблялiся часцей за ўсё з серабра і бронзы.

Заслугоўваюць увагі старажытнасці ранняга Сярэднявечча, знойдзеныя ў Навагрудку і Ваўкавыску [2 с. 397]. Сярод вядомых помнікаў, упрыгожаных металічнымі аздобамі, трэба ўзгадаць такія, як Лаўрышаўскае Евангелле, абклад Евангелля 1508 г. з Дабравешчанскай царквы Віцебска, абклад Евангелля з Віцебска 1598 г., Слуцкае Евангелле, Галынкаўскае («Голынское») канца XVI ст. і інш.

Каштоўным узорам ювелірнага мастацтва з’яўляецца абклад Лаўрышаўскага Евангелля з манастыра на Нёмане каля Навагрудка (Бібліятэка Музея Чартарыйскіх у Кракаве, Польшча). Характар аздобы, як і выкарыстаныя тэхнікі, асаблівасці іканаграфічнай трактоўкі выяў дазваляюць аднесці яго да XIV – пачатку XV ст. У стылістыцы абклада назіраюцца аскетызм і суровасць светаўспрымання, рэалістычнасць выявы, звязаныя з традыцыямі візантыйскай культуры і прафесіяналізмам мясцовых майстроў. Пераплёты Евангелля абцягнуты чырвоным аксамітам, па ім сярэбраныя, часткова пазалочаныя пласціны, што ўзмацняе агульны ўрачысты лад абклада. Ніжні бок пераплёту амаль паўтарае франтальны, выключэннем з’яўляецца толькі сярэднік, дзе змешчана сцэна «Укрыжаванне». На верхняй вокладцы ў сярэдніку абклада, як мяркуецца, – заснавальнік Лаўрышаўскага манастыра князь Лаўрыш-Войшалк.

У XV ст. распаўсюдзіўся гатычны тып пераплёту. Канструктыўна ён уяўляў сабой абцягнутыя скурай дашчаныя вокладкі, абрэзаныя на адным узроўні з блокам кнігі. Металічныя зашпількі выконваліся ў выглядзе колцаў на скураных раменьчыках, якія накідваліся на медныя цвікі, убітыя ў абрэз верхняй вокладкі. У канцы XV ст. у канструкцыі пераплёту з’яўляюцца прыкметы, якія стануць вызначальнымі ў XVI ст. [4].

Пры выкананні каштоўных абкладаў пераплётчыкі супрацоўнічалі з майстрамі залатых спраў. Абклады нававыдадзеных літургічных помнікаў і аднаўленыя пераплёты на старых кнігах сведчаць пра гэта. Асаблівае месца сярод апошніх займае Галынкаўскае Евангелле («Голынское») канца XVI ст. Помнік кніжнай культуры з аксамітавым пераплётам, сярэбранымі навугольнікамі і сярэбранай планкеткай са сцэнай Укрыжавання ў цэнтры верхняй дошкі.

На жаль, шматлікія абклады кніг, выкананыя беларускімі майстрамі-ювелірамі, не захаваліся. Пра іх мы можам меркаваць па канструкцыі і знешнім выглядзе зашпілек з археалагічных раскопак і таксама накладках на Евангелле**.**

Велізарныя страты панеслі і абклады абразоў XIV–XVI стст., з вялікай колькасці якіх захаваліся толькі адзінкі. Самыя раннія беларускія шаты праваслаўных і каталіцкіх абразоў – творы канца XVI ст. [8, с. 143]. Яны, як і аздоба кніг, часта з’яўляліся ўкладнымі, фундацыйнымі аб’ектамі – выконваліся на грошы, ахвяраваныя пэўнай асобай, арганізацыяй – цэхам, брацтвам. Адны былі разрабаваны ў час войнаў, частка пераплаўлена для вырабу новых рэчаў, а іншыя загінулі ў полымі пажараў. Таму пра большасць ювелірных вырабаў можна меркаваць толькі па іх апісаннях у архіўных дакументах і малюнках.

Стылістыка готыкі выявілася ў творах беларускіх ювеліраў асобнымі элементамі, формамі, дэкорам. Больш выразна яна прасочваецца ў прадметах рэлігійнага прызначэння для каталіцкіх храмаў. Значныя адрозненні ў мастацкім вырашэнні начыння праваслаўных і каталіцкіх храмаў назіраюцца ўжо ў вырабах першай паловы XVI ст., але пазней яны згладжваюцца. Развіццё формаў і дэкору твораў ювелірнага мастацтва пачынае праходзіць у рэчышчы агульнаеўрапейскіх мастацкіх стыляў.

Спалучэннем розных відаў апрацоўкі металаў вызначаецца літургічны посуд, у першую чаргу паціры. Паціp звычайна складаецца з гладкай чашы ў чаканеным кошыку, стаяна яйкападобнай формы на нізкай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

балясіне і шырокага круглага паддона. Свяшчэнныя выявы, надпісы, тэхніка выканання і арнаменты паціраў цесна звязаныя з іх літургічным прызначэннем.

На беларускіх паціраx, у адрозненне ад рускіх, заўважаюцца пэўныя рысы мясцовага стылю. Беларускія вырабы гарманічныя па прапорцыях, чаша нярэдка завужаная да нізу. Паціры маюць гатычныя элементы ў формах, накладных і ажурных крыжаватых, крыжападобных матывах, у характэрных квадратных выступах несапраўдных аправаў на «яблыку» [3, с. 126].

Тагачасныя творы хрысціянскага культу працягвалі пераважна візантыйскія традыцыі вырабу каштоўных свяшчэнных рэчаў і ўяўлялі сабой гладкую паўсферычную чашу з абавязковым літургічным надпісам на вянцы, злучаную стаянам з устойлівай асновай-паддонам.

У афармленні паціраў з Беларусі шырокае распаўсюджанне набыла тэхніка чаканкі, на характар якой уплываў пануючы стыль мастацтва. Уласцівыя готыцы рысы і элементы добра прасочваюцца ў паціраx канца XV–XVI стст. з Ружанаў (НММ) і Навагрудка (НГМ), якія тыпалагічна бяруць пачатак з твораў Германіі і Польшчы. На стылістыку беларускіх ювелірных вырабаў аказвала моцны ўплыў і мясцовае культурнае асяроддзе.

Матэрыялы археалагічных раскопак, архіўныя і друкаваныя крыніцы сведчаць, што ў беларускіх гарадах у XII–XVI стст. сярод разнастайных мастацкіх рамёстваў ювелірная справа займала вядучае месца. Нават такі досыць агульны агляд асартыменту прадметаў рэлігійнага культу дазваляе меркаваць пра мастацкую выразнасць, самабытнасць формаў і арнаментацыі ювелірных вырабаў. Узоры мастацкай апрацоўкі металаў дэманструюць гістарычную і семантычную пераемнасць ад язычніцкіх абярэгаў да хрысціянскіх каштоўнасцей. У некаторых вырабах ювелірнага мастацтва адчувальныя ўплывы готыкі, з канца XVI ст. – Рэнесансу.

Бурныя падзеі XVI ст. сталі пераломным этапам у гісторыі беларускага мастацтва. Далейшае яго развіццё адбываецца, галоўным чынам, у межах стылю барока, але з захаваннем вялікай ролі традыцый папярэдняга перыяду.

**Спіс літаратуры:**


1. Алексеев, Л.В. Мелкое художественное литье из некоторых западнорусских земель: кресты и иконки Белоруссии / Л.В. Алексеев // Совет. археология. – 1974. – № 3. – С. 204–219.
2. Археалогія Беларусі : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі ; [навук. рэд. П.Ф. Лысенка]. – Мінск : Беларус. навука, 1997–2001. – Т. 3 : Сярэдневяковы перыяд (IX–XIII стст.) / [Я.Г. Звяруга і інш. ; рэдкал.: В.С. Вяргей і інш.]. – 2000. – 554 с.
3. Беларусы : [у 12 т.] / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларус. навука, 1995–2009. – Т. 8 : Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва / [Я.М. Сахута]. – 2005. – 351 с.
4. Гісторыя беларускай кнігі : у 2 т. / пад агул. рэд. М.В. Нікалаева ; рэдкал.: Т.У. Бялова. – Мінск : Беларус. энцыкл., 2009. – Т. 1 : Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага / М.В. Нікалаеў ; навук. рэд.: В.В. Антонаў, А.І. Мальдзіс. – 424 с.
5. Друцк : Друцк и Друцкая волость (княжество) в IX-XII вв., летопись древних слоев, князья Друцкие и их владения в XIII-XVIII вв., ремесло, промыслы, торговля (по данным археологии, нумизматики, письменных источников), памятники архитектуры и объекты туризма / О.Н. Левко [и др.]; редкол.: А.А. Коваленя (гл. ред.) ; науч. ред. О.Н. Левко ; Нац. академия наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Беларуская навука, 2014. – 619 с.
6. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII–XVIII стст. : альбом / [аўт.-склад. Н.Ф. Высоцкая]. – Мінск : Беларусь, 1984. – 232 с.
7. Жыватворны сімвал Бацькаўшчыны = Животворный символ Отчизны : гісторыя Крыжа святой Еўфрасінні Полацкай / [аўт.-уклад. У. Арлоў ; навук. рэд. Г. Штыхаў]. – Мінск : Асар, 1998. – 326 с.
8. Максімава, Э.С. Мастацкія якасці шатаў абразоў XVI – першай паловы XVII ст. / Э.С. Максімава // Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння / Н.Ф. Высоцкая [і інш.] ; пад рэд. С.В. Марцэлева. – Мінск, 1994. – С. 143–150.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Алена Емялёва*

## ВЫТОКІ І ПЕРШАПАЧАТКОВЫЯ ФОРМЫ МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ: ФАЛЬКЛОР І НАРОДНАЯ МУЗЫКА

Музычная культура Віцебска на працягу стагоддзяў адлюстроўвала і ўвасабляла шматлікія і разнастайныя з'явы і тэндэнцыі. Спачатку гэта былі тэндэнцыі Сярэднявечча, што вызначылі аблічча музычнага мастацтва і культуры X-XV стст., потым былі эпахальныя гісторыка-стылявыя з’явы і тэндэнцыі, якія прынята аб’ядноўваць універсальнымі для еўрапейскай культуры паняццямі Рэнесанса, Барока, Класіцызму і Рамантызму.

Культура старажытных беларускіх зямель мела шмат агульнага з культурай іншых усходнеславянскіх народаў. Але пры ўсёй агульнасці яна мела сваю спецыфіку, якая найбольш яскрава выявілася ў матэрыяльнай і духоўнай культуры Полацкага княства, у склад якога уваходзіў і Віцебск. У IX-XIII стст. там квітнела высокая